# Belarusian publishing in the West

## Bibliography

**Compiled by Zora Kipel and Vitaut Kipel**

**Volume 1Volume 1**

## Periodicals

Belarusian Institute of Arts and Sciences

New York, 2001

# Бібліяграфія беларускага друку на Захадзе

**Апрацавалі Зора Кіпель і Вітаўт Кіпель**

**Частка 1**

## Часапісы, Газэты

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва

New York, 2001

Друкуецца коштам сям'і  Кіпеляў
у друкарні
Міколы Прускага

Belarusian Institute of  Arts and Sciences
Bibliographic Series  ¹ 5

Library of Congress Catalog Card ¹  00 093473

# INTRODUCTORY NOTE

The two volume *Bibliography of Belarusian Publications in the West* records Belarusian-language, and Belarus-related publications in other languages, produced outside of Belarus -- mainly in Western Europe, the Americas, and Australia -- from the mid-19th century, through the year 2000 inclusive.

Volume I of the *Bibliography* is devoted to serials. It lists 414 titles of magazines, newspapers, bulletins, house organs, circulars, and other serial publications, arranged alphabetically by title. Each bibliographic entry consists of title, place of publication, name of editor(s) (when available), the inclusive numbers and dates for ceased publications, and an open date for currents.

Short-run periodicals -- defined as twelve issues or less -- are enumerated and described individually. For long-running publications only the changes (in place of publication, editorial staff, or variant titles) are indicated. There are numerous cross-references to the issuing organizations, and alternate titles. A list of abbreviations commonly used in the Belarusian Diaspora is provided at the end of Volume I.

Volume II of the *Bibliography* covers monographic materials. There are approximately 4,500 items listed, including books, pamphlets, proclamations, press releases, documents and other ephemera. Materials are arranged chronologically by year of publication, and alphabetically within each year. Entries include author, title, place and date of publication, editor, illustrator, and pagination, as well as short annotations and reference to reviews, if extant. An index of authors' names is provided.

Approximately 90 % of the émigré publications represented in these volumes were assembled and recorded over a number of years by Vitaut and Zora Kipel, former staff members of the New York Public Library. In 1999 this unique collection was donated to the Slavic and Baltic Division of the New York Public Library, and the Kipel Family Fund for Belarusian Materials was established. The present *Bibliography* serves as a catalogue of this extensive collection, which is available to researchers from throughout the world, without regard to residency or academic affiliation.

The periodical portion of the Belarusian émigré collection consists of 76 boxes, with the NYPL Slavic and Baltic Division class mark *QM 99-5211.

The monographic portion of the collection is held in 95 boxes, with the NYPL Slavic and Baltic Division class mark *QM 99-5212.

The compilers of the Bibliography offer special thanks to the staff of the Slavic and Baltic Division in preparing this collection for public use.

# УСТУП

У гістарычна-культурным разьвіцьці беларускай нацыі сталася так, што беларускае кнігадрукаваньне пачалося не на Бацькаўшчыне.

Др. Францішак Скарына пераклаў і выдрукаваў у беларускай мове Біблію ў Празе ў 1517 годзе -- год, які ўважаецца за пачатковы беларускага кнігадруку.

Усьлед за Скарынам і іншыя ліцьвіны-беларусы друкавалі кнігі ў Заходняй Эўропе. Гэтак, ведамая палемічная кніга Марка Антонія ў перакладзе ў беларускую мову была выдрукаваная ў Франкфурце ў 1616 годзе (Кніга Беларусі, Мінск, 1986. 94б). Казімір Семяновіч надрукаваў сваю працу *"Artis Magnae Artilleriae"* (Вялікае мастацтва артылерыі) у лацінскай мове ў 1650 годзе ў Амстэрдаме, у францускай мове ў Парыжы ў 1651 г., у нямецкай мове ў Франкфурце ў 1676 г., у Лёндане ў ангельскай мове ў 1729 годзе. Дарэчы, лацінскае, нямецкае й ангельскае выданьні кнігі К. Семяновіча ёсьць у Нью Ёркскай Публічнай Бібліятэцы. У Заходняй Эўропе друкаваў свае кнігі і Галіяш Капіевіч-Капіеўскі (Мысьліцелі і асветнікі Беларусі, Мінск, 1995, ст. 200-222).

Названыя ды іншыя беларускія друкі -- гэта кнігі старога беларускага кнігадруку. Але таксама ведама, што і новы беларускі друк пачаўся не на Беларусі, а навонках яе.

Аляксандр Рыпінскі пачаў друкаваць свае творы ў Парыжы (1840 г.). Верш Паўлюка Багрыма "*Заграй, заграй, хлопча малы*" быў выдрукаваны ў Лёндане ў 1854 годзе. "*Гутарка старога дзеда*" зьявілася ў Парыжы ў 1862 годзе, а крыху пазьней, на пачатку 20-га стагодзьдзя ў Лёндане пачалі друкавацца першыя палітычныя лістоўкі ў беларускай мове. Паза Беларусьсю пачаў друкаваць свае творы і Францішак Багушэвіч. Нью Ёркская Публічная Бібліятэка мае Багушэвічаў "*Смык беларускі*" (Poznań, 1894) а таксама лістоўкі, якія друкаваліся ў Лёндане. Раньнія беларускія выданьні выходзілі таксама ў Цюрыху, Жэневе, Львове, Кракаве, Пазнані ды Пецярбургу.

Гэткім чынам можна сьцьвердзіць, што і стары і новы беларускі друк пачаўся паза Беларусьсю і ніколі не прыпыняўся. Наадварот, пачынаючы ад першай чвэрці 20-га стагодзьдзя беларускае кнігадрукаваньне й

часапісапісьменства з Заходняе Эўропы пашырылася на амэрыканскі кантынэнт, а з паловы таго-ж стагодзьдзя і на аўстралійскі.

Укладальнікі гэтае бібліяграфіі не ставілі мэтай зарэгістраваць стары беларускі друк паза Бацькаўшчынай, дарэчы, кнігі Францішка Скарыны добра апісаныя ды ўлічаныя, але асноўнай мэтай было ўлічыць новы беларускі друк паза Беларусьсю, які існуе вось ужо панад 150 гадоў і, на вялікі жаль, дагэтуль сыстэматычна не рэгістраваўся.

## РАНЕЙШЫЯ БІБЛІЯГРАФІІ

Рэгістрацыя беларускага друку паза межамі Беларусі аднак рабіліся. Гэтак у Менску ад 1925 году *Летапіс беларускага друку* пачаў улічаць некаторыя беларускія выданьні паза БССР. Але ўлік друку дыяспары спыніўся ў 1930-х гадох. Нью Ёркская Публічная Бібліятэка мае поўны камплект *Летапісу*.

Наступная спроба ўліку беларускае эмігранцкае пэрыёдыкі была ў Вільні. У 1949 годзе была выдадзеная вельмі малым накладам "*Библиография белорусских периодических изданий 1861-1944*" ведамага бібліёграфа Владаса Абрамавічюса. У гэтай бібліяграфіі, укладзенай па мейсцу выданьня, улучаная й пэрыёдыка друкаваная ў Бэрліне, Нью-Ёрку, Парыжы, Празе й Чыкага.

У 1953 годзе Мюнхэнскім Інстытутам па вывучэньню гісторыі і культуры СССР быў выдадзены паказьнік пэрыядычных выданьняў эміграцыі за гады 1919-1952. У разьдзеле "*Бібліяграфія эміграцыйнай пэрыёдыкі на беларускай мове*" было зарэгістравана 84 назовы.

Замежны друк спарадычна ўлічаўся ў беларускіх эмігранцкіх газэтах ды часопісах. Газэта "Бацькаўшчына" рабіла часам на сваіх бачынах агляд друку. Дарэчы тут зазначыць і некаторыя недакладнасьці й памылкі, якія траплялі ў друк. Прыкладам, у нумары 21-22 (152-153) "Бацькаўшчыны" за 31 траўня 1953 году паведамлялася, што выйдуць наступныя кнігі: *"Зборнік Узвышэнскае прозы, Зборнік Узвышэнскае паэзіі, кніга Т. Грыба"* аднак кнігі гэтыя ніколі ня былі выдрукаваныя. У дадзенай бібліяграфіі зазначаныя і іншыя недакладнасьці, якія мелі мейсца ў эміграцыйным друку.

Парыскі часапіс "Моладзь" у нумары 18 за 1950 год зрабіў добры рэгістр беларускай пэрыёдыкі, што выходзіла ў гадох 1945-50. (72 назвы). У пачатку 1970-ых гадоў Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва пачаў сыстэматычны ўлік выданьняў дыяспары і выдаваў каталёгі публікацыяў даступных праз Інстытут.

На эміграцыі былі і іншыя бібліяграфіі. Прыкладам, *Сьпісы выданьняў Грамадаўцаў* (Народным Шляхам, № 2, жнівень 1952 г); *Сьпіс беларускіх кружэлак* выдадзены ЗБМА ў 1962 г. ; *Кароткія бібліяграфіі беларускіх публікацыяў у Канадзе,* прыгатаваныя А. Грыцуком у пачатку 1970-ых гадоў.

Рабіліся спробы ўлічыць эмігранцкія рукапісныя выданьні, скаўцкі друк, студэнцкі друк і г. д.

Больш грунтоўнымі і сыстэматычнымі бібліяграфічнымі ўлікамі былі працы Міколы Панькова. У 1948 годзе быў падрыхтаваны "Паказчык Беларускіх Выгнанскіх Друкаў травень 1945 -- 1-га лістапада 1948" (Бацькаўшчына, 12 сьнежня 1948). Затым у1952 годзе М. Панькоў выдаў у Нью-Ёрку публікацыю, якую можна назваць першай беларускай бібліяграфіяй дыяспары -- "*Паказьнік беларускіх выданьняў на чужыне за 1945-1950 гг.*". У 1988 годзе гэтая бібліяграфія была пашыраная й дапоўненая, аднак з прычыны сьмерці аўтара, засталася ня выдадзенай, у манускрыпце.

## АБСЯГ ПРАЦЫ

Пад тэрмінам "Беларускі друк на Захадзе" разумелася друкаваная прадукцыя, якая стварылася беларусамі, беларускімі арганізацыямі, цэрквамі, установамі у беларускай і не беларускіх мовах (ангельскай, нямецкай, французкай і інш.). У паняцьце "Беларускі друк на Захадзе" улучыліся гэтак сама друкі--кнігі, лістоўкі, падручнікі якія ствараліся-друкаваліся небеларускімі установамі, арганізацыямі, асобамі не беларускага паходжаньньня, але якія маюць значаньне для беларускай культуры і нацыі. Прыкладам, лісты-дэкрэты-пасланьні Папы Рымскага ці Канстантынопальскага Патрыярха, дзяржаўныя друкі Кангрэсу ЗША ці Міжнароднае Лігі Правоў Чалавека, якія тычацца Беларусі.

Улучаныя ў Бібліяграфію таксама працы аўтароў беларусаў на тэмы не беларускія, але ў тых працах выказаныя беларускія пагляды. Зарэгістраваныя таксама і працы аўтароў беларусаў перакладзеныя ў заходнія мовы, а гэтаксама падручнікі выдрукаваныя ў Бэрліне па заказу з БССР. Такасама ўлучаныя ў Бібліяграфію перавыданьні эмігранцкіх аўтароў на Бацькаўшчыне. Улічаныя і некаторыя друкі Місіі БССР у ААН, ды прадстаўніцтва БССР у ЮНЭСКА ў Парыжы, якія ня былі зарэгістраваныя Летапісам Друку БССР.

Агульна кажучы, укладальнікі Бібліяграфіі карыстаючыся дасьведчаньнем трыццацігадовае працы ў Нью-Ёркскай Публічнай Бібліятэцы, імкнуліся зарэгістраваць як мага болей беларусаведнага друкаванага матар'ялу, які амаль ніякімі бібліяграфіямі не ўлічаўся.

**Геаграфічныя і храналягічныя рамкі.**

Ахопленыя Бібліяграфіяй беларускія друкі Заходняй Эўропы (на захад ад Польшчы), Паўночнай і Паўдзённай Амэрыкаў і Аўстраліі, а менавіта, Англія, Бэльгія, Гішпанія, Данія, Італія, Нарвэгія, Нямеччына, Фінляндыя, Люксэмбург, Францыя, Чэхія, Швайцарыя, Швэцыя, Югаславія, Мадзяршчына, Канада, Мэксыка, Аргентына, Бразілія, Аўстралія. Краіны, гэтак званага

блізкага замежжа ня ўлучаліся, за выключэньнем аднае беларусаведнае кнігі выдадзенае ў Владзівастоку (Расея) і некалькі кніжак з Польшчы.

Зарэгістраваныя друкі ад першай паловы 19-га стагодзьдзя да 2000 году ўлучна.

**Кніга І-ая Пэрыядычныя выданьні.**

У гэтай частцы Бібліяграфіі ўлучаныя беларускамоўныя часапісы, газэты, бюлетэні, абежнікі, цыркуляры друкаваныя беларускімі арганізацыямі, выдавецтвамі, асобамі. Таксама зарэгістраваныя іншамоўныя пэрыядычныя друкі, якія выдаваліся-рэдагаваліся беларусамі, а гэтаксама іншамоўныя друкі у якіх беларускія арганізацыі былі сувыдаўцамі.

Усяго зарэгістравана 414 пэрыядычных выданьняў, якія па зьместу можна падзяліць на колькі катэгорыяў: Грамадзка-палітычныя; Літаратурна-грамадзкія; Рэлігійныя; Арганізацыйныя, як-то бюлетэні, абежнікі, камунікаты; Часапісы студэнтаў, моладзі, скаўтаў; Вэтэранскія й вайсковыя; Навукова - прафэсыйныя; Гумар і сатыра.

Пэрыёдыка разьмешчаная альфабэтычна паводля назову, са спасылкамі да арганізацыяў-выдаўцоў.

Напрыканцы І-яй кнігі пададзены ***Слоўнік скаротаў ужываных у беларускім эміграцыйным друку.***

**Кніга ІІ-ая. Манаграфічныя друкі.**

У манаграфічнай частцы Бібліяграфіі друкі разьмешчаныя храналягічна, паводля гадоў. У кожным годзе разьмяшчэньне падаецца ў альфабэтычным парадку. Спачатку йдзе альфабэт кірылічны, затым лацінскі.

Улучаныя гэтта кнігі, брашуры; адбіткі разьдзелаў кнігаў (найчасьцей у асобных пераплётах); адбіткі брашурна-манаграфічнага профілю з часапісаў; дысэртацыі, манаграфіі з сэрыйных выданьняў; аднаразовыя камунікаты (улучна з прэсавымі); лістоўкі, адозвы, каталёгі, дакумэнты (пашпарты, пасьведчаньні); статуты, праграмы партыяў; канцэртныя праграмкі (калі была інфармацыя пра Беларусь); карты; плякаты; паштоўкі -- усяго каля 4500 пазыцыяў.

**Сэрыйныя выданьні.** Беларускі друк дыяспары налічвае дзесяткі сэрыяў, некаторыя нумараваныя, некаторыя без нумароў. У Бібліяграфіі сэрыйныя выданьні, пераважна кнігі, рэгістраваліся паасобна з зазначэньнем сэрыяў.

Буйнейшыя з сэрыяў гэткія: Замежная Беларусь (Прага, 1926); Народная Бібліятэка/Бібліятэчка (Бэрлін,1943-45); Бібліятэка Каліноўцаў (Бэрлін, 1944). Бібліятэка Сучаснасьці; Скаўцкая Бібліятэка; Бібліятэка Беларускіх

Гаспадарнікаў на Чужыне; Беларуская Рэлігійная Бібліятэчка -- сэрыі гэтыя друкаваліся ў розныя гады ад 1945 да 1949 ў Заходняй Нямеччыне. Бібліятэка Беларускага Вызвольнага Фронту (Аўстралія, другая палова 1950-ых гадоў) ; Бібліятэка Беларускай Думкі (ЗША, 1960-ыя гады); Выбраныя Дыялёгі (ЗША, 1970-1980--ыя гады) і інш. Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва запачаткаваў некалькі сэрыяў, якія прадаўжаюцца: Беларускія Паэты й Пісьменьнікі на Эміграцыі (11 кнігаў), Бібліяграфічная Сэрыя (выйшла 4 кнігі), Сэрыя да Гісторыі Эміграцыі -- не нумарная.

**Календары.** Ва ўспамінах зазначаецца, што беларускія студэнты ў Празе мелі свой нацыянальны рукапісны каляндар, аднак укладальнікам гэтае Бібліяграфіі тога календара расшукаць не ўдалося. Спрабаваў укласьці беларускі нацыянальны каляндар Язэп Варонка ў Чыкага, але поўнасьцю гэтага не асягнуў, а затрымаўся на "Рускім народным календары" (1928 год), хоць і дадаў гэтаму календару беларускія элемэнты.

Беларускія календары-кнігі на эміграцыі рэгулярна пачалі выдавацца ў Аргентыне ў 1940 годзе.

Па другой Сусьветнай Вайне календары выдавалі беларускія арганізацыі, мастацкія супалкі, газэты, прадпрыймальнікі. Найболей календароў выдавалі царкоўныя структуры: прыходы, епархіі, брацтвы, сястрыцтвы. Як звычай у беларускіх календарох даваліся нацыянальныя сьвяты, рэлігійныя (праваслаўныя й каталіцкія), тэлефоны беларускіх арганізацыяў, а часам і інфармацыі пра Беларусь.

**Каталёгі.** Улічваліся каталёгі выставак, паасобных мастакоў, кніжна-бібліятэчнае дзейнасьці, гандлёвых прадпрыемстваў і г. д. Укладальнікі імкнуліся зарэгістраваць у меру магчымасьці ўсё што зьяўлялася, бо гэты від друкаванае прадукцыі параўнаўча новы для дыяспары.

**Дысэртацыі.** Рабіліся намаганьні ахапіць беларусаведныя дысэртацыі магістарскага (кандыдацкага) й доктарскага ўзроўню. Да мейсца тут будзе зазначыць, што ў бібліяграфію траплялі і студэнцкія і вучнёўскія артыкулы-сэмінары, калі такія распаўсюджваліся шырэйшаму грамадзтву.

**Паштоўкі.** Беларускія паштоўкі на эміграцыі пачалі друкавацца ды распаўсюджвацца ад пачатку 1920-ых гадоў, найбольш коламі БНР, а пазьней добры пачын перанялі мастакі, розныя выдавецтвы, арганізацыі, найчасьцей моладзі. Паштоўкі друкаваліся вялікімі тыражамі. Прыкладам, арганізацыя моладзі ў Кліўлендзе ў гадох 1950-60-ых выдала каля 50 відаў паштовак агульным тыражом каля 40 тысячаў. Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва паштоўку прысьвечаную 100-ым угодкам М. Багдановіча выдаў тыражом 3 тысячы. Паштоўка Памятнага Крыжа ў Канадзе была аддрукаваная тыражом 5 тысячаў; угодкавая паштоўка БНР, 1918-1988, тыражом 3 тысячы. Найбольшы-ж бадай тыраж беларускай паштоўкі быў у 1919 годзе, выдадзенай БНР тыражом 10 тысячаў экзэмпляраў. У дадзенай Бібліяграфіі была спроба

зарэгістраваць першае выданьне паштоўкаў, а перадрукі маглі быць і ня ўлічаныя.

**Паштовыя-непаштовыя маркі.** Бібліяграфія гэтая імкнулася зарэгістраваць усе беларускія паштовыя маркі выдадзеныя паза Беларусьсю. Часам маркі гэтыя наклейваныя на канвэрты гасіліся паштовымі ведамствамі. У пэрыядзе паштовага страйку у Ангельшчыне ў 1971 годзе беларускія маркі нават прызнаваліся ангельскім паштовым ведамствам (Беларус , № 167, 1971).

**Канвэрты.** Від гэтае прадукцыі таксама шырака распаўсюджаны на эміграцыі. У Бібліяграфіі ўлічаныя канвэрты прысьвечаныя беларускім гістарычным гадавінам, выдатным беларускім падзеям, рэлігійным угодкам, юбілеям пісьменьнікаў.

**Іншыя друкі.** Улічана Бібліяграфіяй шмат рэлігійных друкаў, лісткі з малітвамі, нотныя лісткі, іконкі; наклейкі з нацыянальнымі сымбалямі; білеты; рэклямныя лістоўкі; падстаўкі пад бакалы; плякаты; пахаронныя карткі-нэкралёгі і іншае.

## ЗАКЛЮЧНЫЯ РАЗВАЖАНЬНІ

Укладальнікі -- сучасьнікі-удзельнікі пары найбольшага разьвіцьця друку на эміграцыі, а гэта гады 1940-ыя да гадоў 1990-ых -- імкнуліся зарэгістраваць усё, што ўважалі важным як для беларускага руху, культуры, гэтак і з бібліяграфічнага гледзішча. У значнай меры друк эміграцыі -- выяўленьне нацыянальнае думкі, дзяржаўніцкіх інтарэсаў, свабоды. Эміграцыйны друк -- гэта мікракосмас беларускага дзяржаўніка, незалежніка, прадпрыемцы у вялікім рэчышчы штодзённага жыцьця вольнага чалавецтва. Беларускі друк на эміграцыі гэта адначасна частка Беларусі, якую эміграцыя прадстаўляла і якой ганарылася праз даўія гады ў сужыцьці зь іншымі дзяржавамі й народамі.

Гэткім чынам, з мэтай, каб не загінула тое, што рабілася і аб чым укладальнікі ведалі, паўстала думка апрацаваць гэтую Бібліяграфію. Адначасна, з гэтай-жа мэтай, пачалося распісваньне-індэксаваньне некаторых пэрыядычных выданьняў, насамперш газэтаў "Бацькаўшчына" і "Беларус".

## КАЛЕКЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ НА ЗАХАДЗЕ

Акрамя ўкладаньня бібліяграфіі вялося сыстэматычнае зьбіраньне ўсіх выданьняў дыяспары. Сабраная калекцыя, якая ўключае амаль 90 % усяго

ўлічанага ў Бібліяграфіі , была перададзеная Славянскаму Аддзелу Нью-Ёркскай Публічнай Бібліятэкі. Выданьні, якіх няма ў калекцыі пазначаныя ў Бібліяграфіі зорачкай (*), ды, па магчымасьці пададзеная крыніца адкуль інфармацыя пра дадзеныя ўпісы ўзятая. Калекцыя закаталягаваная пад кодамі: ***QM 99-5211** і ***QM 99-5212** а гэтая Бібліяграфія зьяўляецца, ў пэўнай меры, каталёгам да калекцыі. Чатыры копіі Бібліяграфіі, закаталягаваныя пад кодам ***R-Slav. Div. 75-106,** далучаныя да галоўнага каталёгу Славяна-Балтскага аддзелу Нью Ёркскай Публічнай Бібліятэкі. У будучыні мяркуецца мікрафільмаваньне калекцыі Беларускага друку на Захадзе з мэтай перахаваньня калекцыі ды распаўсюджваньня сабранай спадчыны другім бібліятэкам.

## ПАДЗЯКА

Укладальнікі выказваюць глыбокую падзяку тым, хто дапамагалі ў зьбіраньні матар'ялаў для гэтай Бібліяграфіі: Мітрапаліту Мікалаю, а. Александру Надсону і ягонаму супрацоўніку Юрасю Лаўрыку, Людміле Рабок; спадаром Янку Запрудніку, Віталю Кажану, Алесю Міцкевічу, Антону Шукелойцу, Сяргею Шупу, Браніславу Даніловічу, Антону Даніловічу, Васілю Мільяновічу, Міхасю Белямуку, Міколу Латушкіну, Міхасю Наумовічу, Лявону Шыманцу, Юраму Туронку, Міхасю Сеньку, Нікодыму Жызьнеўскаму; спадарству Міхасю і Валянціне Пашкевічам, Веры і Вітаўту Рамуком, Лёлі і Янку Міхалюком, Івонцы і Янку Сурвілла; спадарыне Вользе Грыцук і асабліва спадарыням Ірэне Пануцэвіч і Людвіцы Бяленіс.

# А

**Абвесткі Беларускага Дзяржаўнага Прэс-Бюро**

Бэрлін-Прага

[1919]? -- Выходзіў штотыдня.

Інфармацыя зь бібліяграфіі.

**Abieźnik. Ab'jednanne Biełarusau Absalventau Louvain'skaha Universytetu "Academicus"**

Louvain, Ab'jednanne Biełarusau Abselventau Louvain'skaha Universytetu "Academicus"

№ 1, 29.1.1954

ад № 2., 11. 7. 54 -- Academicus [Акадэмікус] тэкст кірыліцай -- Сакратарыят АБАЛУ

№ 3, 24. 12. 54

№ 4 , studz. 1956 -- тэкст лацінкай -- апошні ведамы нумар.

**Абежнік. Аб'еднаньне Беларускіх Лекараў на Чужыне**

Immendorf, D.P. Camp ABC Watenstedt, Whiteruthenian Medical Association Abroad

№ 1, 25 мая 1947 – № 50 сак. 1952

ад № 5, 30. 10. 1947 -- Goslar -- Abiežnik

ад № 28 , 15.6. 1949 -- Unterluss

ад № 31, 1.8. 1949 -- Abjednanńnie Bielaruskich Lekarau na Cužynie. Abiežnik

ад № 37, сьнеж. 1949 -- Burgdorf b. Hannover

ад № 47 , сьнеж. 1950 -- ZWA, Paterson, N.J.

**Абежнік. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Акруга Нью Ёрк**

New York

№ 1, кастр. 1954 -- ведамы адзін нумар.

**Abiežnik. Biełaruski Wyzwolny Front. Halouny Štab**

Stuttgart

№ 1, 1958 -- № 1/90, чэрв. 1990

Абежнікі друкаваліся гэтаксама ў часапісе "Барацьба"

ад № 1/69 ("Барацьба"№ 1-2 (67-68), студз.-сак. 1969) -- назоў **Абежнік Галоўнага Штабу Беларускага Вызвольнага Фронту.**
Назоў часта мяняўся і ўжываліся ініцыялы арганізацыі.
Гл. таксама: **Камунікат. Беларускі Вызвольны Фронт. Галоўны Штаб**

**Абежнік. Беларускае Студенцкае Таварыства у ЗША**
Нью-Ёрк
№ 1, [1952]?
№ 2, 17.11.53
ад № 3, 1.8.54 -- Abiežnik. Biełaruskaje Studenckaje Tavarystva u Amerycy
№ 4, list . 1954 -- Abiežnik. Biełaruskaje Studenckaje Tavarystva u Z.H.A.
№ 5, 30 lip. 1955
ад № 6, люты 1957 -- зноў кірыліцай -- Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства ў Амэрыцы
№ 7, [ліп.] 1957
[№ 8], ліст 1957 -- Абежнік Галоўнае Управы Беларуска-Амэрыканскага Акадэміцкага Таварыства
№ 9, сьнеж. 1959 -- **Інфармацыйны Бюлетэнь БААТ**
ад № 10, трав. 1960 -- **Абежнік БААТ**
[№ 11], жнів. 1960
[№ 12], žniv. 1991 -- Abiežnik BAAT
№13, ліст 1961 -- апошні ведамы нумар.
Публікацыі Беларускага Студэнцкага Таварыства пачаліся ў 1951 годзе як Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Студэнцкага Таварыства у ЗГА.
Гл. таксама: **Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Студэнцкага Таварыства ў ЗГА**

**Абежнік. Беларуская Друкарня. The Whiteruthenian Press ***
New York
№ 1, кастр. 1962 -- ведамы адзін нумар.

**Абежнік. Беларускі Дапамаговы Камітэт у Нямеччыне. Брытанская Зона**
Ватэнштэт
№ 1/47, 12. 5. 47 -- 1/13, 1950

№ 2, 9 чэрв. 1947 -- Беларускі Дапамаговы Камітэт Брытанскай Зоны Нямеччыны
№ 4, 21.11, 1947 -- Беларускі Дапамаговы Камітэт Брытанскае Зоны Нямеччыны, Ольдэнбург
№ 1/7, 1949 -- Biełaruski Nacyjanalny Kamitet Brytanskaje Zony Niameččyny. Abiežnik

**Абежнік. Беларускі Досьледчы Інстытут імя К. Каліноўскага**
[Таронта], Рада Беларускага Досьледчага Інстытуту
№ 1/54, сьнеж. 1954

**Абежнік. Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва**
Нью Ёрк
№ 1, верас. 1953 -- № 17, сьнеж. 1969
Спэцыяльны выпуск 2/4/58 з заклікам выдаць камэнтары-папраўкі да кнігі Н. Вакара, загаловіўшы яго "ERRATA".
№17, сьнеж. 1969 -- апошні ведамы нумар.

**Абежнік. Byelorussian Democratic Republic**
[ЗША]
№ 1, 1974
№ 2, 1974 -- у: "Летапіс " № 59 (б. 71)

**Абежнік. Згуртаваньне Беларускіх Скаўтаў на Чужыне. Галоўная Кватэра**
Маервік, Рэфэрат сталых скаўтаў і скаўцкіх інструктараў
№ 1, 25 студз. 1948
№ [2], 15 студз. 1949 -- Згуртаваньне Беларускіх Скаўтаў. Галоўная Кватэра -- апошні ведамы нумар.

**Abiežnik. Sajuz Biełaruskich Zurnalistych**
Oldenburg [рэд. М. Панькоў]
№ 1, 1948 -- № 10, 1950

**Абежнік. Сэктар Рады БНР у ЗША**
Brooklyn, N.Y. [рэд. К. Мярляк]
№ 1, студз. 1955.

№ 2, lip. 1955 -- Abiežnik. Sektar Rady BNR u ZŠA. Уключае: Załučnik da Abiežnika № 2 -- апошні ведамы нумар.

**Abiežnik. United Whiteruthenian (Byelorussian) American Relief Committee**
New York
№ 1, 3 list. 1951 -- ведамы адзін нумар.

Абежнік Б.А.А.Т. Гл.
**Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

Абежнік Беларускага Вызвольнага Фронту. Гл.
**Abiežnik. Biełaruski Wyzvolny Front. Halouny Štab**

**Абежнік Беларускага Вызвольнага Руху**
Англія,
кастр. 1957

Абежнік Галоўнага Штабу Беларускага Вызвольнага Фронту. Гл.
**Abiežnik. Biełaruski Wyzvolny Front. Halouny Štab**

Абежнік Галоўнай Управы Беларуска-Амэрыканскага Акадэміцкага таварыства. Гл.
**Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

**Абежнік Згуртаваньня Беларускіх Жанчын у Нью Джэрзі ***
[New Brunswick]
[Чэрв. 1965] -- адзіны ведамы нумар.

**Абежнік Ц К А Б Н Д**
[Cleveland, Ohio Рэд. А. Каханоўскі]
№ 1, ліп. 1953
№ 2 , жнів. 1953 і папраўлены нумар, датаваны верас. 1953
ад № 3, ліп. 1955 -- Абежнік Цэнтральнага Камітэту Аб'еднаньня Беларускіх Нацыянял-Дэмакратаў
№ 4, студз. 1956
№ 5, трав. 1956
№ 6, сьнеж. 1956

**Аб'еднаньне.** Chryscjanskaje Abjednannie Biełaruskich Rabotnikau u W. Brytanii London, United Christian Whiteruthenian Workers in Gr. Britain
№ 1, 23 сак, 1948 Год 1 -- № 108, чэрв. 1966 Год 19
Месячнік
ад № 2, 28 крас. 1948 -- назоў арганізацыі кірыліцай: Хрысьціанскае Аб'еднаньне Беларускіх Работнікаў у В. Брытаніі
ад № 1/99, студз.1964 -- квартальнік. Назоў на вокладцы лацінкай: **Abjednańne**. Union. The Anti-communist periodical in Byelorussian
Апошні нумар за 1961 год памылкова быў пазначаны № 4/90 -- павінна быць № 4/91.

Abjednańne Biełarusau Absalnentau Louvain'skaha Universytetu "Academicus". Abieżnik. Гл.
**Abieżnik. Abjednańnie Biełarusau Absalventau Louvain'skaha Universytetu "Academicus"**

Abjednańnie Biełarusau Absalventau Luvenskaha Universytetu "Academicus". Abieżnik. Гл.
**Abieżnik. Abjednańnie Biełarusau Absalventau Luvenskaha Universytetu "Academicus"**

Аб'еднаньне Беларускіх Лекараў на Чыжыне. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Аб'еднаньне Беларускіх Лекараў на Чужыне**

**Ahladčyk**
[Нямеччына, Ангельская Зона]
№ 40/1, 28 trav. 1946 -- № 103, 12. 4. 47
На некаторых нумарох няма загалоўку. Нумар часопісу і дата прыпісаны алавіком
№ 85/1, 1.1. 1947 -- падзагаловак: "Bielaruski časapis samaaśvety"
№ 101, 1.4. 1947 -- Biełaruski rukapisny tydniovik samaaśviety
Рукапісны тыднёвы часапіс лацінкай. Фармат розны.
Прадаўжэньне часапісаў **"Biełarus na Čužynie"** і **"Vyhnaniec"** і іх нумарацыя прадаўжаецца.
Выходзілі гэтаксама дадаткі : **Za Volu**: Dadatak pryśviečany vyzvolnamu ruchu**;** **Šypšyna.** Hramadzka-navukovy dadatak

Гл. таксама **Biełarus na Čužynie; Vyhnaniec**

**Адзінства. Unity. Единство. Єдність**

Mönchehof/Kassel DP Camp, Club YMCA

№ 1, 1946 -- № 6, 1949

Шматмоўны, пераважна беларуска-расейскі-украінскі, часапіс моладзі. № 3 сшыты з часопісам "Па дарозе праўды".

**Adradžeńnie. Časapis Biełarusau katalikou**

Regensburg, Hrupa Biełarusau katalikou.

На вокладцы, над загалоўкам: Na pravoch rukapisu.

№ 1, sak. 1947 Hod 1

№ 2-3, kras.-maj 1947

№ 1, sak. 1948 Hod II -- Windischbergerdorf üb/Cham, Weissruthenisches DP Lager

№ 2-3, maj-čyrv. 1948

Academicus [Акадэмікус]**.** Abjednańnie Biełarusau Absalventau Louvain'skaha Universytetu. Гл. **Abieżnik. Ab'jednannie Biełarusau Absalventau Louvain'skaha Universytetu "Academicus"**

**Анаграфы. Anagraphs**

Gainesville, Fla., Byelorussian Charitable Educational Fund. Ed. G. Piotrowski

Афіцыяльны часапіс Беларускага Харытатыўнага Адукацыйнага Фонду.

№ 1, Nov. 1977

№ 2-3, Nov. 1978-1979 -- апошні ведамы нумар.

**Апошнія Весткі.** Інфармацыйны лісток

Ватэнштэт

№1, 26 студз. 1948 -- № 38, 5 мая 1948 і № 1 (38) [1(39), 2 ліп.?], 1948

ад № 2, 28 студз. 1948 -- падзагаловак -- Інфармацыйны бюлетэнь

ад № 7, лют. 1948 -- Браўншвайг

№ 1 (38) [мусіць 1(39)], [2 ліп.?] (Дата нявыразная), 1948 -- Мюнхен

**Апошнія Навіны.** Інфармацыйны бюлетэнь

Бакнанг, Выд. Рада лягеру Бакнанг

№ 1, 11 сьнеж. 1949 Год 1
№ 2, 15 сьнеж. 1949 -- ведамыя два нумары.

**Асьцюк**. Грамадзка-палітычны незалежны часапіс сатыры і гумару
[Нямеччына]
№ 1, студз. 1953 Год 1 -- ведамы адзін нумар.

# Б

BAAT. Abiežnik. Гл.
**Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

БАБler. Гл. **The БАБler**

**Барацьба.** Газэта прысьвечана беларускаму нацыянальна-вызвольнаму руху
Berlin, verantwort. Red. Paul Darnberger
Штомесячнік
№ 1 -- № 3, 1932
№ 1(4) -- № 2 (5), 1933

**Барацьба.** Цэнтральны Орган Беларускага Вызвольнага Фронту
[Штутгарт], Палітычна-Прапагандовы Аддзел Галоўнага Штабу БВФ
№ 1 сак. 1955 -- № 87-88, студз.-жнів. 1979 Год 25
Ад № 1(24) -- таксама "Baraćba"-- Zentralorgan die Bielarussische Berfreiungsfront
Выйшла 88 паасобных нумароў.
Выйшлі гэтаксама скансалідаваныя гадавікі "Барацьбы"
№ 89-92, 1945-1974 -- храналёгія падзеяў
№ 93-95, 1975-1989 -- храналёгія падзеяў
№ 96-98, 1955-1980 -- дакумэнтацыя
№ 99-101, 1981-1989 -- дакумэнтацыя

**Бацькаўшчына. Whiteruthenian Newspaper "The Fatherland".** Беларуская тыднёвая газэта
Osterhofen, Administration
№ 1, 31 кастр. 1947 -- № 4 (637), сьнеж. 1966 Год 20
ад № 26 (29), 5 верас. 1948 -- edited by Whiterhthenian National Committee
ад № 8 (52), 25 сак. 1949 -- responsible publisher Wladimir Bortnik
ад №15 (59), 18 трав. 1949 -- Rosenheim
ад № 63, 15 верас 1950 -- München
ад № 64, 5 ліст 1950 -- загалоўкі таксама па-ангельску і па-француззку
ад № 69, 31 жнів. 1951 -- Орган Беларускай Нацыянальна-Вызвольнай Думкі
ад № 23 (205), 13 чэрв. 1954 -- Ворган Б- Н-В- Д-
ад № 12 (596), 22 жнів. 1962 -- Орган Б-Н-В-Д-
ад № 11-12 (90-91), 25 сак. 1962 друкаваўся штомесячна дадатак для дзяцей **"Каласкі",** які пазьней, ад чэрв. 1952, выходзіў асобнымі сшыткамі.
Гл. таксама **Каласкі**

**Баявая Ускалось.** Орган Літаратурнай Сустані "Баявая Ускалось"
[Ольдэнбург, Нямеччына]
№ 1, ліп. 1949, Год 1 -- № 18, верас. 1981 Год 32
№ 2, сьнеж. 1949 -- Ворган Літаратурнай Сустані "Баявая Ускалось"
Ад № 1/4, 1954- друкуецца ў Таронце, Канада, выд. Літаратурнай Сустані "Баявая Ускалось"
Ад № 6, сак. 1962 -- зьменшаны фармат. Падзагаловак таксама -- Byelorussian monthly magazine.

**Беларус.** Часопіс Беларусаў у З. Г. А. **Byelarus.** Byelorussian newspaper in the U.S.A.
New York, Выд. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне. Editor-in-chief L. Halak
№ 1, 20 верас. 1950 Год 1 --
Рэдактары праз гады мяняліся. Напачатку выходзіла нерэгулярна -- кожныя 2-4 месяцы.
ад № 2 (26), 24 студз. 1953 --- ангельскі падзагаловак: Whiteruthenian (Byelorussian) newspaper in the USA

№ 5 (29), 7 сак. 1953 -- на першай старонцы памылкова пададзена № 4 (28)
Паміж 20 верас. 1958 г. (№ 70) і ліст. 1961 (№ 71) газэта ня выходзіла
ад № 71, ліст. 1961 -- месячна, падзагаловак: Bielarus. Byelarussian Newspaper
ад № 80, ліст. 1963 -- пад-загаловак: Часапіс беларусаў Паўночнае Амэрыкі. Bielarus. Byelorussian Newspaper of North America -- New York-Toronto -- уключае старонку "Весткі з Канады". Фармат пабольшаны
ад № 136, ліп.-жнів. 1968 Год 18 -- падзагаловак: Газэта беларусаў у вольным сьвеце. Bielarus. Byelorussian Newspaper in the Free World
ад № 393, верас. 1992 -- падзагаловак Belarusan Newspaper in the Free World
ад № 399, сак. 1993 -- газэта друкуецца й распаўсюджваецца гэтаксама на Беларусі
Непэрыядычна друкуюцца: "Жаноцкая старонка", ангельскія старонкі, а гэтаксама календары.

**Biełarus na Cužynie**
[Oldenburg]
№ 1 žniv. 1945
№ 2, 7 vieraś. 1945
№ 3, 13 vieraś. 1945
№ 4, 20 vieraś. 1945
№ 5, 27 vieraś. 1945
Рукапісны часапіс. Прадаўжаўся як **Vyhnaniec**, затым **Ahladčyk**
Гл. таксама **Vyhnaniec; Ahladčyk**

**Беларус на чужыне. Biełarus na Čužyne. Whiteruthenian Abroad**
London, Vyd, red. kalehija Bielaruskaha vydaviectva, [гал. рэд. А. Надсан ці Я. Амор]
Dvutydniovik.
№ 1, 7 kastr., 1947 Hod -- № 18 (42), 8 крас. 1950 [Год 4] (на часопісе памылкова пададзена -- Год 3)
№ 8 [12] , 22 крас. 1948 -- памылкова пададзены як № 8 (11)
ад № 3 (27), 13 люты 1949 -- выд. B.N.N.Ch.R.

№ 14 (38) быў выдадзены падвойна: адзін -- 31 žniun. 1949 -- нумар гэты быў рэдагаваны Аморам і за ягоны артыкул "Kali bicca dyk tolki za siabie", падпісаны Jar, ня быў дапушчаны да кальпартацыі; другі -- 17 vieras. 1949. Тэкст лацінкай альбо кірыліцай.

**Беларус у Амэрыцы. Byelorus in Amerika**
South River, N.J. [Editors: Янка Ніхаёнак, Барыс Кіт]
Месячнік
№ 1, верас. 1948 Год 1
№ 2 , кастр.-ліст. 1948
№ 3 , сьнеж. 1948
№ 4 , сак. 1949 Год 2
Выйшла 4 нумары. Па-беларуску і па-ангельску.

**Беларуска.** Часапіс Беларускага Жаночага Аб'еднаньня ў Францыі
Парыж, Беларуская Жаночая Грамада імя Цёткі, рэд. Ніна Раса
№ 1, 1947
Выйшаў адзін нумар.

Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне Нью Ёрку. Бюлетэнь Гл.
**Бюлетэнь-Bulletin. Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне Нью Ёрку**

Беларуска-Амэрыканскае Акадэміцкае Таварыства. Abiežnik. Гл.
**Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне. Аддзел Кліўленд. Бюлетэнь. Гл.
**Бюлетэнь. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне. Аддзел Кліўленд**

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Акруга Нью Ёрк. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Акруга Нью Ёрк**

Беларуска-Амэрыканская Нацыянальная Рада ў Чыкаго. Весткі. Гл.
**Весткі БАНР**

Biełaruskaje Akademickaje Katalickaje Abjednańne Ruń. Infarmacyjny Biuleteń. Гл.

**Ruń. Biełaruskaje Akademickaje Katalickaje Abjednańne. Infarmacyjny Biuleteń**

Беларускае Праваслаўнае Брацтва й Сястрыцтва Жыровіцкае Божае Маці у Вялікабрытаніі. Бюлетэнь. Гл. **Бюлетэнь. Беларускае Праваслаўнае Брацтва й Сястрыцтва у Вялікабрытаніі**

Беларускае Прэс-Бюро. Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускай Рады у Празе. Гл. **Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускай Рады у Празе**

**Biełaruskaje Radyjo Nioman. [Kalendar]**
Chicago, WEDC 1240 KC, рэд. Н. Жызьнеўскі
1964 --
Выходзіць штогоду кірыліцай і лацінкай.

**Беларускае Слова. Byelarussian Word**
Michelsdorf b. Cham, W. Germany [Рэд. А. Русак, Ю. Стукаліч, Ю. Сабалеўскі]
№ 1, 17 сьнеж. 1948 -- № 2 (39), крас.-чэрв. 1958 Год 8
Напачатку газэта выходзіла як: Appendix to the Ukrainian newspaper "Ukrainian News"; ад № 4(5), 25 сак. 1949-- як самастойнае выданьне
ад № 7/8 , 18 чэрв. 1949 -- Backnang bei Stuttgart
№ 2 (14), 25 сак. 1950 -- Адмысловае выданьне. Зьменшаны фармат.
ад № 1 (15) , 25 сак. 1954 Год 4 -- назоў таксама Weissruthenisches Word
ад № 3 (32) , сьнеж. 1956 Год 6 -- выходзіць у South River, N.J. [рэд. Я. Кіпель]

**Беларускае Слова ў Амэрыцы. Byelarussian Word in America**
Грамадзка-Літаратурны часапіс
New Brunswick, N.J., Redakcyjnaja kalehija , [рэд. С. Коўш]
№1 , студз. 1950
№2, люты 1950
На правох рукапісу. Выйшла 2 нумары.

Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША. Абежнік. Гл. **Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

Беларускае Студэнцкае Таварыства ў ЗГА. Інфармацыйны Бюлетэнь. Гл. **Інфармацыйны Бюлетэнь Беларускага Студэнцкага Таварыства у ЗГА**

Гл. таксама: **Абежнік. Беларускае Студэнцкае Таварыства у ЗША**

**Biełaruska[ja] Akademija Bahaviedy**

Princeton, Biełaruskaja Chryscijanskaja Subožnia (kaścioł)

№ 1, list 1960

№ 2 (3), sak. 1961 Hod II

№ 3 (4), čyrv. 1961 -- загаловак таксама па-ангельску: Byelorussian Theological Academy

№ 4 (5), vieraś 1961 Hod II -- загаловак : Беларуская Акадэмія Багаведы

№ 5 (6), sniež. 1961

№ 6 (7), studz. 1962 Hod III

№ 2 (8), sak. 1962 -- мае назоў **"Белорусікум"**

Biełaruskaja Autakiefalnaja Pravasłaunaja Carkva u Vialikaj Brytanii. Kamunikat. Гл. **Kamunikat. Bełaruskaja Autakiefalnaja Pravasłaunaja Carkva u Vialikaj Brytanii**

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Кансісторыя. Бюлятэнь. Гл. **Бюлятэнь. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Кансісторыя**

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква ў Клыўлендзе. Бюлетэнь. Гл. **Бюлетэнь Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў Клыўлендзе**

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Царкоўны Пасланец. Гл. **Царкоўны Пасланец**

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Катэдральны Сабор Сьв. Кірылы Тураўскага. Інфармацыйны Бюлетэнь. Гл. **Інфармацыйны Бюлетэнь. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, Катэдральны Сабор Кірылы Тураўскага**

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Торонто. Бюлютэнь Парафіяльнай Рады. Гл.
**Бюлютэнь Парафіяльнай Рады. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Торонто**

**Беларуская Воля**
[Garmisch-Partenkirchen, Беларуская Народная Партыя, рэд. Я. Кіпель, выд. С. Жамойда]
№ 1, 10 сьнеж. 1947 - - № 18-1 (19-20), сьнеж. 1949 - студз. 1950
ад № 3/4, 5 лют. 1948 -- загаловак таксама --Bielarusien Volition
ад № 16/17, 26 кастр. 1948 -- падзагаловак --орган Беларускай Народнай Партыі

Беларуская Друкарня. The Whiteruthenian Press. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Беларуская Друкарня. The Whiteruthenian Press**

**Biełaruskaja Dumka**
[Watenstedt] Biełaruski Katalicki Parachvijalny Kamitet u Vatenštecie
№ 1, niadziela 6 kras. 1947
№ 2, 26 trav. 1947 Hod 1
Тэкст кірыліцай і лацінкай. Выйшла 2 нумары.

**Беларуская Думка. Byelorussian Thougth.** Грамадзка-Палітычны і літаратурна-мастацкі часапіс
Нью-Ёрк - Саўт Рывэр, Выд. Беларускае Выдавецкае Таварыства ў ЗША
(Рэд. калегія: Л. Галяк, А. Даніловіч, М. Кавыль, інж. І. Касяк, пратапр. М. Лапіцкі, др. М. Шчорс).
№ 1, кастр. 1960 Год 1 --
№ 8 мае падзагаловак па-ангельску: The Byelorussian Outlook on Society, Politics, Literature and Arts
Выданьне прадаўжаецца.

**Беларуская Зарніца.** Царкоўна-народны часапіс
South River, N.J. Орган праваслаўных беларусоў (у эміграцыі). Рэд. а. Сьвятаслаў Коўш
№ 1 на эміграцыі, [1987]

№ 2 на эміграцыі, трав. 1988
№ 3, сьнеж. 1989 -- апошні ведамы нумар
Аднаўленьне аднаназоўнага часопісу, які выходзіў у 1920-х гадох у Вільні, рэдагаванага а. Аляксандрам Каўшом.

Беларуская Інфармацыйная Служба. Гл. **БІС**

**Беларуская Інфармацыя.** Інфармацыйны лісток беларусаў Гановэру *
[Гановэр] Выдаецца пры Літоўскім Нацыянальным Прадстаўніцтве
30 чэрвеня 1945
2-гі нумар выйшаў у ліпені 1945, пад назовам: **Інфармацыя** (Панькоў)

Беларуская Кроніка. Гл. **Belarusian Chronicle. Беларуская Кроніка**

**Беларуская Моладзь. Byelorussian Youth.** Квартальны часапіс беларускага маладога пакаленьня ў Амэрыцы
Brooklyn, Выд. Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы
№ 1, студз. 1959 -- № 51-52 1980
Ад №16, кастр.-сьнеж. 1962 -- выдаюць: Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы і Саюз Беларуска-Амэрыканскае Моладзі
Выданьне прыпынілася на № 26, трав. 1967 Год выд. 9
Часапіс друкаваўся ў беларускай і ангельскай мовах.
У 1972 годзе часапіс аднавіўся пад назовам: **Byelorussian Youth Беларуская моладзь**, Pub. by the Byelorussian-American Youth Organization
Vol. 1, № 1(27), fall 1972 -- Vol. 7, № 1-2 (51-52), 1980
Таксама выходзілі аказыйныя дадаткі:
Дадатак [№ 1] да № 5-- Learn to read Byelorussian
Дадатак [№ 2] да № 6 -- Lerne Weissruthenisch zu lesen
Дадатак № 4 -- Моўныя рэсурсы Амэрыкі
Supplement № 5 -- Lithuania-Litva
Дадатак да № 8-- Выбары Прэзыдэнта ЗГА
Дадатак [1961]-- Why does Voice of America discriminate against the Byelorussian language?
Дадатак 10 кастр. 1962 -- Інфармацыйны Бюлетэнь Камітэту Набыцьця Беларускага Цэнтру Адпачынку

Беларуская Народная Рэспубліка. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Камунікаты. Гл.
**Камунікаты Рады Беларускай Народнай Рэспублікі**

Беларуская Народная Рэспубліка. Сэктар Рады БНР у ЗША. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Сэктар Рады БНР**

Беларуская Народная Рэспубліка. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Інструкцыя. Гл. **Інструкцыя Прадстаўнікам Ураду БНР у Розных Дзяржавах Сьвету**

Беларуская Народная Рэспубліка. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі. Інфармацыя. Гл. **Інфармацыя Прадстаўнікам Ураду БНР у Розных Дзяржавах Сьвету**

Беларуская Незалежніцкая Партыя. Бюлетэнь. Гл.
**Бюлетэнь Беларускай Незалежніцкай Партыі**

Беларуская Праваслаўная Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Торонта. Паведамленьні. Гл. **Паведамленьні. Беларуская Праваслаўная Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Торонта**

**Беларуская Праўда. Die Bielorussische Wahrheit.** Часапіс Нацыянальна-Дзяржаўных Спраў
Windsberg, West Germany. [Рэд. Ю. Попка]
№ 1, крас. 1965 -- № 43/88, трав. 1988 Год 24
ад № 14, люты 1973 -- падзагаловак таксама Byelorussian Truth
ад № 21, трав. 1974 -- няма ангельскага і нямецкага загалоўкаў
№ 43/88, 1988 -- апошні ведамы нумар.
Некаторыя артыкулы й дакумэнты ў ангельскай мове.

**Biełaruskaja Prauda. La Verite Bielorussienne.** Supplement à "Au Travail"
Charleroi, Federation Syndicales Chretiens, Section Bielorussienne, Red. V. Zavaditch
№ 1, 1 lut. 1947 Hod 1
№ 2, 1 sak. 1947

№ 3, 15.7. 1947 -- загаловак кірыліцай: Беларуская Праўда; падзагаловак: Syndykalny orhan Sajuzu Biełarusau u Belhiji -- апошні ведамы нумар.

**Беларуская Трыбуна. Byelorussian Tribune**. Орган Незалежнае Беларускае Думкі
Jackson Heights, N.Y., Злучаны Беларуска-Амэрыканскі Дапамаговы Камітэт. Рэд. М. Шчорс, Я. Ляшчынскі
vol. 1, no.1, Aug. 27, 1950 -- vol. 4, no. 3 (17), list. 1953
ад vol. 1, no. 2, Nov. 5 -- Wallington, N. J.
ад № 2 (5), March 25, 1951 --- Garfield, N. J.
№ 5 (8), Sept. 30, 1951 -- выдае Беларускі Выдавецкі Фонд у ЗША

**Беларуская Царква.** Нацыянальна-рэлігійны штомесячны часапіс беларусаў у Чыкага
Chicago, Выдае Беларуская Выдавецкая Сябрына
№ 1, сак. 1956 Год 1 -- № 29, 1965
№ 9 -- падвойны: № 9, крас.-трав. 1958 -- кірыліцай; № 9a, kras.-trav. 1958 -- лацінкай
Вялікдзень 1958 -- Дадатак "Вялікодны лісток"
№ 29, 1965 -- апошні ведамы нумар.

Беларуская Цэнтральная Рада. Бюлетэнь. Гл.
**Бюлетэнь Беларускай Цэнтральнай Рады**

Беларуская Цэнтральная Рада. Цыркуляр. Гл. **Цыркуляр БЦР**

**Biełaruskaja Chryscijanskaja Artadaksalna-katalickaja Subožnia** (Naślednica Litouskaje Jadnoty)
Princeton, Vyd. Ks. Dr. U. Ryžy-Ryski
№ 1, [trav.?] 1960 Hod 1 -- № 2 (14), 30 studz. 1961 Hod. 2
№ 10, 1 vieras. 1960 -- Biełaruskaja Chryscijanskaja Artadaksalna-katalickaja Subožnia (Kaścioł)
№ 12, 24 śnież. 1960 -- Biełaruskaja Chryścijanskaja Subožnia (Artadaksalna-Katalickaja). Назоў па-ангельску: Byelorussian Christian Church (Orthodoxaly-Catholic)

**Biełaruski Viestavy Listok u Francuzkaj Zonie. Letter d'Information Bielorussienne en Zone Francaise**
[Saulgau]
[№ 0], 28 sak. 1948
№ 1, kras.1948
№ 2, 11 kras. 1948

Беларускі Вызвольны Рух. Інформацыйны Бюлетэнь. Гл.
**Інформацыйны Бюлетэнь Беларускага Вызвольнага Руху**
Беларускі Вызвольны Рух. Цэнтральны Камітэт. Камунікат. Гл.
**Камунікат. Беларускі Вызвольны Рух. Цэнтральны Камітэт.**

Беларускі Вызвольны Фронт. Галоўны Штаб. Абежнік. Гл.
**Abieżnik. Biełaruski Wyzwolny Front. Halouny Štab**

Беларускі Вызвольны Фронт. Галоўны Штаб. Камунікат. Гл.
**Камунікат. Беларускі Вызвольны Фронт. Галоўны Штаб**

**Беларускі Голас. Byelorussian Voice.** Незалежны часапіс беларускае эміграцыі
Торонто, Беларускі Незалежны выд. Фонд у Канадзе
Месячнік.
№ 1, 25 сакавіка 1952, Год 1 -- № 370, ліп. 1992, vol. 43/4
Ад 1957 -- выд. М. Сіняк (Хмара)
Ад № 367, сак. 1992 -- назоў **Водгаласы.** News in Review, critique and information. Special edition Byelorussian Voice
-- **Сігналы.** Літаратурны дадатак да газэты -- № 1, люты 1957 - № [37], крас. 1975 (у нумарох газэты 30 -- 232).
-- **Беларусы ў Канадзе** -- дадатак 1967, 1970 -- нерэгулярна. па-беларуску і па-ангельску
-- **Маланка** -- гумарыстычны дадатак. Гл. **Маланка**

**Беларускі Дайджэст. Belarusian Digest.** Часапіс беларускага замежжа ў Амэрыцы
№ 1, ліст. 1993 Год 1 --
Выданьне прадаўжаецца.

Беларускі Дапамаговы Камітэт у Нямеччыне. Брытанская Зона. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Беларускі Дапамаговы Камітэт у Нямеччыне. Брытанская Зона**

Беларускі Досьледчы Інстытут імя К. Каліноўскага. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Беларускі Досьледчы Інстытут імя К. Каліноўскага**

**Беларускі Зборнік**
Мюнхэн, Інстытут Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР
кн. 1, студз.-сак. 1955 -- кн. 12, 1960
Назоў гэтаксама па-ангельску, па-нямецку і па-француску. Частка матар'ялаў перакладалася ў ангельскую мову і друкавалася ў **Belarussian Review.**
Гл. таксама **Belarussian Review**

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва. Абежнік. Гл.
**Абежнік. Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва**

**Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва. Bibliographic Series**
Нью-Ёрк, БІНІМ
Сэрыя запачаткаваная ў 1985 годзе
Гл. паасобныя творы у другой частцы гэтай Бібліяграфіі: Кнігі

**Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва. Byelorussian Poets and Writers Series**
Нью-Ёрк, БІНІМ
Сэрыя запачаткаваная ў 1979 годзе
Гл. паасобныя творы у другой частцы гэтай Бібліяграфіі: Кнігі

